# Мясніковіч здзейсніў рабочую паездку ў Савецкі раён Мінска

27.07.2018 00:44 | Аўтар: Вераніка Пуставіт (/be/tags/veranika-pustavit) | Грамадства (/be/gramadstva), Навука (/be/navuka)

**Міхаіл Мясніковіч, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, здзейсніў рабочую паездку ў Савецкі раён Мінска. Падчас яе спікер наведаў навукова-тэхналагічны парк БНТУ «Палітэхнік», сустрэўся з рэктарамі ВНУ, кіраўнікамі ўстаноў сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Пасля гэтага адбыўся прыём грамадзян Савецкага раёна. Яны цікавіліся магчымасцю выплаты мінімальнай сацыяльнай стыпендыі ўсім студэнтам, правам прысваення вучоных званняў, будаўніцтвам студэнцкага кампуса.**

(h




Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч ініцыяваў стварэнне інстытута дзяржаўных экспертаў у Беларусі, які даваў бы аб'ектыўную ацэнку навуковым і інавацыйным праектам, што прэтэндуюць на фінансавую падтрымку дзяржавы або рэальнай сферы эканомікі. У першую чаргу гаворка ідзе аб навуковых распрацоўках інавацыйнага характару, для рэалізацыі якіх прыцягваецца бюджэтнае фінансаванне або фінансаванне прадпрыемстваў.

Каб гэтыя праекты сапраўды працавалі, павінна быць вельмі сур'ёзная экспертыза. Яе трэба зрабіць больш жорсткай, асабліва для тых праектаў, якія рэалізуюцца за кошт бюджэтных сродкаў. «Для гэтага трэба стварыць інстытут дзяржаўных экспертаў, — лічыць сенатар. — Магчыма, яны павінны зацвярджацца рашэннем кіраўніка дзяржавы. Калі эксперт ставіць свой подпіс, гэта будзе казаць пра тое, што канкрэтная навуковая тэматыка або інавацыйная распрацоўка з'яўляецца сапраўды новай не толькі для айчыннай эканомікі, але і на сусветным узроўні. У гэтым выпадку менш будзе дробных тэм і патэнтаў і навукова-тэхнічных справаздач, якія ляжаць на паліцы», — падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі.

Акрамя таго, прамысловыя прадпрыемствы Беларусі не заўсёды гатовыя да ўкаранення інавацый, якія распрацоўваюцца ў сценах вышэйшай школы і акадэмічных устаноў. На думку спікера верхняй палаты парламента, у гэтым не варта вінаваціць тых ці іншых асоб, бо патрэбны механізмы, каб напрацоўкі, якія даюць навука і ўстановы адукацыі, неслі мінімальныя рызыкі для работнікаў вытворчасці.

Што датычыцца падрыхтоўкі кадраў, то заказ навуцы і адукацыі ў першую чаргу павінна даваць прамысловасць. «Не зусім аптымальнае рашэнне, калі заказ на падрыхтоўку кадраў фарміруе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Яны працуюць з тым, што ўжо ёсць, а варта падумаць пра тое, што трэба. Таму ў большай ступені гэта Міністэрства эканомікі, а інфармацыя туды сцякаецца з месцаў», — канстатаваў ён.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што поспех эканомікі краіны шмат у чым залежыць і ад таго, як і каго рыхтуюць вышэйшая школа і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. «Мы вядзём размову з прадстаўнікамі Міністэрства адукацыі, Мінгарвыканкама і гарсавета, кіраўнікамі ВНУ, а таксама кіраўнікамі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесійна-тэхнічных устаноў у духу тых патрабаванняў, якія вылучае кіраўнік дзяржавы наконт неабходнасці павышэння якасці адукацыі. Чалавек, які атрымлівае дыплом, павінен быць інавацыйным, харызматычным. Ён у тым ліку кіраўнік, які будзе не толькі добрым спецыялістам і экспертам, але і арганізатарам вытворчасці», — падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі.

«Сёння адбылося падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве паміж аддзяленнем фізіка-тэхнічных навук НАН і БНТУ. Гэта тыя інструменты, звёны, якія дазваляюць гаварыць пра сувязь навукі, адукацыі і вытворчасці», — падкрэсліў ён.

**Вераніка ПУСТАВІТ**

### Загаловак у газеце: Інстытут для экспертаў

### Чытайце таксама

**Што карыснага для сябе пачулі прадстаўнікі мясцовай улады ў Пасланні Прэзідэнта? Меркаванні (/be/news/20230404/1680620894-shto-karysnaga-dlya-syabe-pachuli-pradstauniki-myascovay-ulady-u-paslanni)**

**Не толькі скардзіцца, але і дзякаваць – прынцып работы Пікуля (/be/news/20221108/1667918779-ne-tolki-skardzicca-ale-i-dzyakavac-pryncyp-raboty-pikulya)**

**Выдавецкі дом «Звязда» разам з дэпутатам падарыў калекцыю дзіцячых кніг шматдзетнай сям'і з Клічава (/be/news/20210902/1630599074-vydavecki-dom-zvyazda-razam-z-deputatam-padaryu-kalekcyyu-dzicyachyh-knig)**

**Грошы — медыкам, школам, на храм і не толькі (/be/news/20210902/1630590614-groshy-medykam-shkolam-na-hram-i-ne-tolki)**

**Рэгіянальны форум «Беларусь адзіная» прайшоў у Наваполацку (/be/news/20210902/1630589487-regiyanalny-forum-belarus-adzinaya-prayshou-u-navapolacku)**

Тэгі: Мясцовае самакіраванне (/be/tags/myascovae-samakiravanne)

2045 праглядаў Русский (/ru/news/20180727/1532677088-mihail-myasnikovich-iniciiroval-sozdanie-instituta-gosudarstvennyh) Друкаваная версія (/be/print/138809)

Падзяліцца:

(https://vk.com/share.php?url=http%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20180726%2F1532614002-myasnikovi
(https://connect.ok.ru/offer?url=http%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20180726%2F1532614002-myasnikov
(https://twitter.com/intent/tweet?text=%D0%9C%D1%8F%D1%81%D0%BD%D1%96%D0%BA%D0%BE%D0%B2%D1
(viber://forward?text=%D0%9C%D1%8F%D1%81%D0%BD%D1%96%D0%BA%D0%BE%D0%B2%D1%96%D1%87%
(https://t.me/share/url?url=http%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20180726%2F1532614002-myasnikovich-z


Навіны | Папулярнае

16:17 Рагашчук: памяць пра подзвіг беларускага народа заўсёды павінна заставацца ў нашых сэрцах (/be/news/20230505/1683292636-ragashchuk-pamyac-pra-podzvig-belaruskaga-naroda-zausyody-pavinna)

15:53 Нацбанк прапанаваў абмеркаваць змяненні ў закон аб крэдытных гісторыях (/be/news/20230505/1683291211-nacbank-prapanavau-abmerkavac-zmyanenni-u-zakon-ab-kredytnyh-gistoryyah)

15:35 Забароны і абмежаванні на наведванне лясоў уведзены ў 57 раёнах Беларусі (/be/news/20230505/1683290116-zabarony-i-abmezhavanni-na-navedvanne-lyasou-uvedzeny-u-57-rayonah-belarusi)

15:13 Іванец на ўзнагароджанні лепшых педагогаў сталіцы: настаўнік — не проста прафесія, гэта прызванне душы (/be/news/20230505/1683288815-ivanec-na-uznagarodzhanni-lepshyh-pedagogau-stalicy-nastaunik-ne-prosta)

14:49 Дзе забароняць паркаваць аўто ў цэнтры сталіцы 9 мая (/be/news/20230505/1683287359-dze-zabaronyac-parkavac-auto-u-centry-stalicy-9-maya)

УСЕ НАВІНЫ (/BE/NEWS)


**Іншыя матэрыялы аўтара**


Гісторыя беларуса, які наведаў больш за 30 краін (/be/news/20180803/1533273346-gistoryya-belarusa-yaki-navedau-bolsh-za-30-krain)

Наталля Ляхавец: Хочацца файную сукенку? Даверцеся швачцы! (/be/news/20180801/1533133178-natallya-lyahavec-hochacca-faynuyu-sukenku-davercesya-shvachcy)

Беларусь прыме этап «Экалагічна дружалюбнага фермера Балтыйскага рэгіёна» (/be/news/20180726/1532614206-belarus-pryme-etap-ekalagichna-druzhalyubnaga-fermera-baltyyskaga-regiyona)

Што адбылося за тыдзень у Савеце Рэспублікі (/be/news/20180726/1532613809-shto-adbylosya-za-tydzen-u-savece-respubliki)

Якія выклікі паўстаюць перад беларускай экспартаарыентаванай эканомікай? (/be/news/20180712/1531408797-yakiya-vykliki-paustayuc-perad-belaruskay-ekspartaaryentavanay-ekanomikay)

(https://declarant.by/ru/)

# Выбар рэдакцыі

(/be/news/20230504/1683210339-geametryya-na-klumbe-i-fokus-na-klasiku-park-u-gomeli-plyacouka-kvetkava)

Грамадства (/be/gramadstva)

Геаметрыя на клумбе і фокус на класіку... Парк у Гомелі — пляцоўка кветкава-колеравай тэрапіі (/be/news/20230504/1683210339-geametryya-na-klumbe-i-fokus-na-klasiku-park-u-gomeli-plyacouka-kvetkava)

Прыгажосць — і спакуса і паратунак.

0 466

(/be/news/20230504/1683208802-vidavochca-peramogi-vaennaya-peradavaya-partyzana-mihaila-citova)

Грамадства (/be/gramadstva)

«Відавочца Перамогі». Ваенная перадавая партызана Міхаіла Цітова (/be/news/20230504/1683208802-vidavochca-peramogi-vaennaya-peradavaya-partyzana-mihaila-citova)

Ён з пакалення тых людзей, чыя маладосць прыйшлася на канец 40-х гадоў.

0 401

(/be/news/20230502/1683029239-imunny-kupal-yakiya-novyya-pryshchepki-moguc-stac-dastupnymi-u-belarusi)

Грамадства (/be/gramadstva)

Імунны купал. Якія новыя прышчэпкі могуць стаць даступнымі ў Беларусі? (/be/news/20230502/1683029239-imunny-kupal-yakiya-novyya-pryshchepki-moguc-stac-dastupnymi-u-belarusi)

Як пандэмія паўплывала на вакцынацыю ў Беларусі.

0 505

(/be/news/20230421/1682084633-trymaem-porah-suhim-yak-prahodzic-kompleksnaya-praverka-bayavoy-gatounasci)

Грамадства (/be/gramadstva)

Трымаем порах сухім. Як праходзіць комплексная праверка баявой гатоўнасці Узброеных Сіл

(https://be.news/2023/04/21/1682084633-trymaem-porah-suhim-yak-prahodzic-kompleksnaya-praverka-bayavoy-gatounasci)

Махавік праверкі баявой гатоўнасці Узброеных Сіл працягвае набіраць абароты.

0 1268

**Нашы партнёры:**

(http://mininform.gov.by/ru/) (http://pravo.by/) (http://www.belros.org/) (http://ww

(/)

ПАДПІСКА (/BE/SUBSCRIPTION)

© 1998—2023 Усе правы належаць рэдакцыі РВУ “Выдавецкі дом “Звязда”.
Пры выкарыстанні публікацый сайта актыўная гіперспасылка на крыніцу і аўтара абавязкова.

Газета "Звязда" (/be/edition)
Рэклама (/be/advertising)
Праекты (/be/projects)
Архіў (/be/pdf)

Палітыка (/be/palityka)
Эканоміка (/be/ekanomika)
Грамадства (/be/gramadstva)
У свеце (/be/u-svece)
Культура (/be/kultura)
Калейдаскоп (/be/kaleydaskop)
Спорт (/be/sport)
Нашы выданні (http://zviazda.by/be/about)
Кнігі (http://zviazda.by/be/page/bibliyateka-zvyazdy)

9 306
6 353
6 021
(https://metrika.yandex.by/stat/?id=37842935&from=informer)

(https://vk.com/zviazda) (https://www.instagram.com/zviazda.by/)
(https://t.me/zviazda_online)

Создание информационного сайта Создание сайта webxayc.by (https://webxayc.by)